УДК 78.071.1(477)(092)

**В. У. Дадзіёмава**

# З БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКІХ СУСТРЭЧ: ДА БІЯГРАФІІ А. ВЕДЭЛЯ

Репозиторий Учреждения образования "Белорусская государственная академия музыки"



*Дадзіёмава Вольга Уладзіміраўна* – *доктар мастацтвазнаўства, дацэнт, загадчыца кафедры беларускай музыкі*

У гісторыі музычнай культуры Беларусі вядома нямала старонак, цікавых не толькі для беларускага, але і для славянскага і, шырэй, агульнаеўрапейскага музыказнаўства. Большасць з іх звязана з дзейнасцю на Беларусі ўраджэнцаў розных краін (ад Расіі, Польшчы, Украіны да Італіі, Францыі, Германіі), а таксама ўкладам выхадцаў з Беларусі (такіх, як В. Казлоўскі, С. Манюшка, Н. Орда і інш.) у музычныя культуры іншых народаў. Падобная сітуацыя, адлюстроўваючы ўсеахопны працэс міжкультурнага ўзаемадзеяння, безумоўна, не з'яўляецца унікальнай і шмат у чым характэрна для кожнай культуры. Аднак для культуры айчыннай, якая спрадвеку развівалася на перакрыжаванні розных мастацкіх шляхоў, гэты працэс асабліва паказальны, а кожны факт, што мае да яго дачыненне, набывае прынцыповую значнасць. Таму натуральна, што матэрыялы, якія адкрываюць невядомыя раней беларускія рэаліі жыцця ўкраінскага кампазітара А.Ведэля, не маглі не прыцягнуць нашу ўвагу. Гэтыя матэрыялы прывёз у Мінск выдатны дзеяч украінскай культуры, энтузіяст і шукальнік Яўген Леанідавіч Махнавец. Сустрэцца з ім мне параіў Ігар Міхайлавіч Лучанок, даўно знаёмы з даследчыкам.

Яўген Леанідавіч, працягваючы сямейныя традыцыі (яго бацька, Леанід Махнавец, – вядомы гісторык старaславянскай літаратуры), імкнецца захаваць і аднавіць мастацкую спадчыну. Ён ужо каля 20 гадоў вывучае жыццё і творчасць Арцёма Лук'янавіча Ведэля (1767/?/–1808), буйнейшага славянскага музыканта канца XVIII – пачатку XIX ст. Кампазітар, спявак і дырыжор, аўтар грандыёзных духоўных канцэртаў, кіраўнік харавых калектываў у Кіеве,

Маскве і Харкаве, А. Ведэль разам з М. Беразоўскім і Дз. Бартнянскім з'яўляецца адным з класікаў украінскай і рускай музыкі. Яго творчасць пастаянна знаходзілася ў цэнтры ўвагі музыкантаў і даследчыкаў – ад вучня А. Ведэля кампазітара П. Турчанінава да сучасных музыколагаў і гісторыкаў – Л. Корній, І. Саневіцкага, В. Кука і інш. [гл.: 3, *297-301*; 4; 8; 10]. Паводле матэрыялаў гэтых аўтараў, Ведэль нарадзіўся ў Кіеве, вучыўся ў тамтэйшай акадэміі (да 1787 г.), а потым быў накіраваны ў Маскву. Між тым, паводле даных Я. Махнаўца [5, 6], Ведэль нарадзіўся ў Беларусі, а дакладней – у Магілёве, дзе атрымаў і першапачатковую музычную адукацыю. Крыніцы, якія пацвярджаюць прыведзеныя звесткі, былі знойдзены Я. Махнаўцом у архіўных дакументах, дзе пра бацьку кампазітара сказана літаральна наступнае: «Лук'ян, Уласаў сын, ураджэнец польскага мястэчка Магілёва» [6, *124*]. Ён нарадзіўся ў 1740 г., быў маляром і аздабляў храмы розных канфесій, а ў год нараджэння Арцёма распісваў магілёўскі касцёл. Маці кампазітара, Алена, дачка Рыгора, таксама нарадзілася ў 1740 г. у Магілёве, дзе яе бацька (дзед Ведэля) быў рэгентам царкоўнага хору. У гады дзяцінства кампазітара сям'я жыла на землях Спаса-Праабражэнскага храма (Спаскай царквы) [там жа].

Варта згадаць, што ў другой палове XVIII ст. Магілёў быў адной з важнейшых апор праваслаўя на беларускіх землях. Тут знаходзіўся цэнтр адзінай (да часу далучэння да Расіі) праваслаўнай епархіі. Тут жа дзейнічаў і выдатны праваслаўны асветнік, паслядоўнік і выдавец прац Ф. Пракаповіча, рэктар Кіева-Магілянскай акадэміі, епіскап магілёўскі (з 1755 г.) Георгій Каніскі. Менавіта ён, як вядома, яшчэ ў 1757 г. адкрыў пры магілёўскім архірэйскім доме тыпаграфію, а пры Спаскім манастыры – школьныя класы і духоўную семінарыю [2, *84-85*]. Пасля ўваходу Магілёва ў склад Расійскай імперыі (у 1772 г.) епіскап канчаткова пераязджае ў горад. Спаская ж царква (адбудове якой таксама паспрыяў г. Каніскі) і ў ранейшыя гады адыгрывала важную ролю ў рэлігійным жыцці края і часта згадвалася ў гістарычных крыніцах. Так, захаваліся матэрыялы 1745 г. аб святкаванні пры гэтай царкве ўрачыстасцей, у якіх прымала ўдзел «брацкая музыка» [9, *280*]. Славіліся таксама і магілёўскія царкоўныя хары, аб якіх з захапленнем пісаў падарожнік у другой палове XVIII ст.: «Я прысутнічаў на рускай літургіі ў саборы. Яна была простая і ўрачыстая: простая ў сваёй унутранай будове, але бліскучая і пышная ў сваіх вонкавых формах. Там не было ігры скрыпак і нават ніводнага сола сапрана, каб прыцягнуць увагу тысячы вернікаў. Усе, ад вялікага да малога, стаялі ціха і з пашанаю прыслухоўваліся да спеваў, малітваў і розных чытанняў. Два хоры спевакоў, якія, здавалася, ведаюць толькі напевы старых грэчаскіх хрысціянскіх тонаў, спявалі ўперамежку: часам яны спявалі разам, а часам толькі адны сапрана, або іншыя галасы – дысканты, тэнары, альты і басы, – але ў канцы яны заўсёды зліваліся ў адзін хор» [7, *31*].

Вернемся да біяграфіі Ведэля. Як лічыць Я. Махнавец, сваё прозвішча кампазітар, выхадзец з ніжэйшых сацыяльных колаў, атрымаў ласкаю Ганны Радзіёнаўны Ведэль, жонкі намесніка Кацярыны ІІ Захара Чарнышова. Яна апекавалася архірэйскім домам і, уражаная музычнымі здольнасцямі хлопчыка, вырашыла, па тагачаснай традыцыі, падараваць яму сваё прозвішча [гл.: 6, *125*].

Першапачатковыя музычныя навыкі будучы кампазітар атрымаў ад дзеда па матчынай лініі, які, магчыма, садзейнічаў і паступленню хлопчыка ў Магілёўскую духоўную семінарыю. У гады вучобы Арцём праявіў выдатныя здольнасці і быў заўважаны не толькі прэфектам навучальнай установы, але і самім Георгіем Каніскім [там жа].

Нагадаем, што магілёўская семінарыя давала сваім выхаванцам выдатныя веды ў галіне музычнага мастацтва. З семінарыстаў нават набіралі пеўчых у архірэйскі хор. Вядома таксама, што хлопчыкі вучыліся спевам, ігры на флейце і віяланчэлі [гл. 1]. Семінарыя была на той час і моцным агульнаадукацыйным цэнтрам. Не дзіва, што Ведэль, маючы грунтоўную падрыхтоўку і карыстаючыся падтрымкай г. Каніскага, змог у 1780 г. паступіць у Кіева-Магілянскую акадэмію. Паводле даных Я.Махнаўца, у тым жа годзе ў Кіеў пераехалі і бацькі Арцёма, якія доўгі час жылі ў хаце яшчэ аднаго выхадца з Беларусі – Васіля Мазырскага, рамесніка кіеўскага іканапіснага цэха [гл.: 6, *125*].

Далейшыя падзеі ў жыцці кампазітара ўжо звязаны з гісторыяй Украіны і Расіі, у культуры якіх Ведэль зрабіў вельмі значны ўклад. Цікава, аднак, што нават па заканчэнні акадэміі, у гады працы ў Маскве, Ведэль па-ра-

Рэпазіторый Учреждения образования "Белорусская государственная академия музыки"

нейшаму лічыўся літвінам – выхадцам з беларускіх земляў…

Што тычыцца іншых звестак аб дзейнасці гэтага выдатнага прадстаўніка славянскага мастацтва на Беларусі, дык нам застаецца выказаць шчырую ўдзячнасць Яўгену Махнаўцу, які працягвае іх пошук і вывучэнне, а таксама спадзявацца на далучэнне да гэтай працы беларускіх даследчыкаў.

***Літаратура***


1. *Горючко П. С.* Материалы для истории Могилевского архиерейского хора (1798–1805) // Материалы для истории церквей Белоруссии конца XVIII и начала XIX столетий. Могилев, 1903.
2. *Дышыневіч В.* Каніскі Георгій // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 4. Мн., 1997.
3. *Корній Л.* Історія української музики. Т. 2. Київ; Харків; Нью-Йорк, 1998.
4. *Кук В.* Нові дані про Артема Ведельского-Веделя // Українське музикознавство. 1969. № 5.
5. *Махновець Е.* Артем Ведель. 1799 рик // Науковы вісник НМАУ. Вып. 11. Кіїв, 2001.
6. *Махновець Е., Шудря М.* Допоки тече Дніпро // Пам’ять століть. 2004. № 6.
7. *Пікарда г. дэ.* Царкоўная музыка на Беларусі (989-1995). Мн., 1995.
8. *Соневицький І.* Артем Ведель і його музична спадщина. Нью-Йорк, 1966.
9. *Сурта Т., Трубницкий Ю.* Могилевская хроника // Полное собрание русских летописей. Т. 35: Летописи белорусско-литовские / Сост. и авт. предисл. Н. Н. Улащик. М., 1980.
10. *Турчанинов П. И.* Автобиография // Домашняя беседа для народного чтения. Вып. 6. СПб., 1863.


Репозиторий Учреждения образования "Белорусская государственная академия музыки"